УДК 351.852.12/.13:[792.03+792.07](476)

# МАТЭРЫЯЛЫ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА-МУЗЕЯ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА ЯК КРЫНІЦЫ АБ ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АКАДЭМІЧНАГА ТЭАТРА ЮНАГА ГЛЕДАЧА

***А. Я. Паўлава,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле прадстаўлены вынікі вывучэння матэрыялаў з фондаў Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра юнага гледача (ТЮГ), Беларускага тэатральнага аб’яднання (БТА) і асабістых збораў рэжысёраў і акцёраў тэатра, якія захоўваюцца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. Аўтар даследуе справаводчыя дакументы, рукапісы, рэцэнзіі, газетныя публікацыі і фотаздымкі аб дзейнасці ўстановы і яе акцёрскага складу. Робіцца выснова аб ступені рэпрэзентатыўнасці матэрыялаў для выкарыстання іх у якасці крыніц па гісторыі дзейнасці тэатра.

**Ключавыя словы:** архіўныя фонды, асабістыя калекцыі, Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача, тэатральныя пастаноўкі, газетныя артыкулы, водгукі крытыкаў.

# MATERIALS OF THE BELARUSIAN STATE ARCHIVE-MUSEUM OF LITERATURE AND ART AS SOURCES ON THE ACTIVITIES OF THE BELARUSIAN STATE ACADEMIC THEATER FOR YOUNG SPECTATORS

***E. Pavlova,***
*PhD in History, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Historical and Cultural Heritage of the Educational Establishment «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article presents the results of the study of materials from the funds of the Belarusian Republican Theatre of Young Spectators (TYS), the Belarusian Theatre Association (BTA) and personal collections of the theatre directors and actors kept in the Belarusian State Archive-Museum of Literature and Art. The author examines office documents, manuscripts, reviews, newspaper publications and photographs about the activities of the theatre and its cast. The

conclusion is made about the degree of representativeness of the materials for their use as sources on the history of the theatre.
**Keywords:** archival funds, personal collections, Republican Theatre of Young Spectators, theatre productions, newspaper articles, reviews of critics.

Вялікую ролю ў папулярызацыі твораў культуры сярод падрастаючага пакалення адыгрывае тэатр: тут фарміруецца эстэтычны густ, закладваюцца ідэалы, фарміруецца мера ацэнкі дасканаласці і прыгажосці. Праз 3 гады, у 2026 г., Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача адзначыць 70-гадовы юбілей з даты свайго пасляваеннага адкрыцця. Калі ж адлічваць гісторыю спецыялізаванага беларускага тэатра для дзяцей і юнацтва з 1931 г., то тэатр набліжаецца да стагадовага юбілея.

У зборах Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ) адклаліся крыніцы аб дзейнасці тэатра, яго кіраўнікоў і акцёраў. Гэта фонд Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача (Ф. 80), асабістыя архіўныя зборы У. М. Стэльмаха (Ф. 111), Л. І. Мазалеўскай (у складзе фонда П. Малчанава – Ф. 292), В. Пацехіна (Ф. 150), Л. Я. Цімафеевай (Ф. 319), П. М. Макаля (Ф. 417), А. В. Вольскага (Ф. 76). Матэрыялы аб дзейнасці ТЮГ адклаліся таксама ў зборы кампазітара Я. Глебава (Ф. 276) і ў фондзе Беларускага тэатральнага аб’яднання (Ф. 156).

Фонд тэатральнай установы дастаткова невялікі. Сярод справаводчых дакументаў захаваліся загады кіраўніцтва па асноўнай дзейнасці, перапіска з Міністэрствам культуры БССР, пратаколы паседжанняў мастацкага савета тэатра і вытворчых нарад за перыяд 1967–1987 гг. Найбольшую цікавасць даследчыкаў уяўляюць матэрыялы аб першых трох дзесяцігоддзях дзейнасці тэатра. Гэта рэпертуарныя планы, справаздачы і публікацыі СМІ аб дзейнасці ТЮГ. З захаваўшыхся дакументаў вынікае, што кіраўніцтва тэатра бачыла сваёй задачай спалучаць у рэпертуары пастаноўкі па творах савецкай і сусветнай класікі, дзіцячыя казкі, у т. л. з нацыянальным каларытам, і спектаклі па творах беларускіх аўтараў. У сваёй творчасці калектыў звяртаўся да тэм гераічнага мінулага і абароны дзяржаўнай мяжы [2, арк. 3; 3, арк. 7]. Ужо ў першыя гады дзейнасці калектыў тэатра неаднаразова выязджаў на гастролі па рэспубліцы і двойчы ў раён цэлінных зямель Казахскай ССР [2, арк. 31, 133, 134].

Візітнай карткай ТЮГ стаў спектакль «Папараць-кветка», які ў 1957 г. на ўсесаюзным фестывалі атрымаў дыплом першай ступені [3, арк. 33–39]. Заўсёды актуальнай была і тэма подзвігаў моладзі ў часы ваеннага ліхалецця («Юныя мсціўцы», «Марат Казей», «Маладая гвардыя»). Неабходна адзначыць, што ў фондзе ТЮГ і ў асабістых архіўных зборах акцёраў адклаліся афішы і праграмы спектакляў

тэатра за 1955–1997 гг.: ад простых у афармленні («Чаму мне не пець, чаму не гудзець», «Дзяўчынка і красавік», «Дарога праз ноч», «Несцерка») да каляровых буклетаў з цытатамі і фрагментамі дэкарацый («Зялёная птушка» (філалагічная фіяба К. Гоцы), «Дай вады, калодзеж!» П. Макаля, «З любімымі не раставайцеся» А. Валодзіна і інш.) [5, арк. 8–27].

Дапаўняюць гэтыя пісьмовыя крыніцы фотаматэрыялы са сцэнамі са спектакляў з асабістых збораў Л. Мазалеўскай («Горад майстроў», «Мінулася кату масленіца», «Аркадзь Жыгалкін») і Л. Я. Цімафеевай, якая працавала актрысай ТЮГ з 1955 па 1990 г. і ўвасобіла шматлікія рамантычныя вобразы ў пастаноўках тэатра («Папараць-кветка», «Юныя мсціўцы», «За лясамі дрымучымі», «Несцерка», «Зорка Венера», «Зялёная птушка» і інш.). У фондзе В. Пацехіна адкладаліся рэжысёрскія экспазіцыі, пастановачныя планы і размеркаванне роляў пры падрыхтоўцы першых спектакляў [10, арк. 1–67].

Кампазітар Я. Глебаў пачынаў сваю працоўную дзейнасць як музычны кіраўнік у Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры юнага гледача і напісаў музычнае суправаджэнне да 20 спектакляў ТЮГ. У яго асабістым зборы можна азнаёміцца з клавірамі гэтых твораў, праграмамі («Тры мушкецёры», «На ўсіх адна бяда», «Мядовае каралеўства») і афішамі. У складзе фонда кампазітара знаходзіцца беларускамоўны буклет пра ТЮГ, у якім распавядаецца пра гісторыю тэатра, афішы спектакляў, сцэны са знакавых спектакляў і фотаздымкі акцёраў, рэцэнзіі ў вядучых газетах Беларусі, аповед пра летнія гастролі ў Казахстане [15, арк. 1–33].

Прытрымліваючыся формулы «спектаклі для дзяцей і юнацтва трэба іграць як для дарослых, толькі лепей», кіраўніцтва тэатра клапацілася аб працы з гледачамі. Дакументы фонду ТЮГ сведчаць аб рэгулярным правядзенні сустрэч з дырэктарамі школ і класнымі кіраўнікамі для абмеркавання сувязяў тэатра са школамі і прагляду новых пастановак. На генеральныя рэпетыцыі спектакляў запрашаліся прадстаўнікі піянерскага і камсамольскага актыву [3, арк. 20]. У час школьных канікул кіраўніцтва тэатра арганізоўвала для вучняў сустрэчы з артыстамі. Так, за вясеннія канікулы 1983 г. працаўнікі тэатра сустрэліся з вучнямі 14 мінскіх школ, а таксама дзіцячых дамоў г. Мінска і Мінскай вобласці [6, арк. 12]. На летні перыяд фарміраваўся часовы творчы калектыў, які выязджаў у піянерскія лагеры для паказу адрыўкаў са спектакляў-казак. Аднак мастацтвазнаўца Т. Арлова ў сваіх заўвагах аб рабоце тэатра пазначала, што такая «мабілізацыя» гледачоў сіламі бацькоў дашкольнікаў і школьных настаўнікаў не дазваляе калектыву тэатра ўбачыць, які рэпертуар сапраўды прываблівае гледача [13, арк. 9–18].

Артыкул часопіса «Беларусь» сведчыць, што ў сярэдзіне 1980-х гг. артысты ТЮГ актыўна клапаціліся аб сваёй змене і выкарыстоўвалі

выхадны ад спектакляў дзень для сустрэч з удзельнікамі дзіцячых тэатральных студый сталіцы [16, арк. 10]. У 1991 г. дырэктар тэатра І. С. Андрэеў звяртаўся да Міністра культуры БССР Я. К. Вайтовіча і ў Камісію па культуры Мінгарвыканкама з ідэяй стварэння ў межах рэспубліканскай праграмы «Тэатр – дзецям» дзіцячай тэатральнай студыі пры Рэспубліканскім тэатры юнага гледача з далейшай трансфармацыяй яе ў дзіцячы тэатр. Для ажыццяўлення задумы неабходна было звязаць у адзіны комплекс тры будынкі: ТЮГ, палац піянераў і гаркам партыі [7, арк. 11]. Нават у 1990-я гг. тэатр браў удзел у міжнародных падзеях. Так, у лістападзе 1994 г. шэраг супрацоўнікаў тэатра ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы і правядзенні Міжнароднай канферэнцыі і трыянале «Тэатр – дзецям» [8, арк. 32].

У заўвагах аб дзейнасці ТЮГ Т. Арлова адзначыла, што «тэатральны» густ дарослых гледачоў напрамую залежыць ад працы з імі з перыяда дзяцінства. Таму акцёр ТЮГ павінен быть максімальна пластычным і ўмець добра адчуваць настроі гледачоў у зале. З мэтай папулярызацыі сваіх дарослых спектакляў «мабільныя» калектывы з ліку артыстаў тэатра выязджалі са скарочанымі версіямі для выступлення перад маладымі рабочымі мінскіх прадпрыемстваў. Удзельнічаў тэатр і ў культурна-асветніцкай дзейнасці сярод працаўнікоў сельскай гаспадаркі.

Асаблівасцю фондаў тэатральных устаноў і дзеячаў з'яўляецца той факт, што такія зборы акумулююць у сабе багаты збор публікацый СМІ аб пастаноўках тэатра і рэцэнзій на спектаклі [4, арк. 1–20]. Газетныя артыкулы ў вядучых рэспубліканскіх СМІ, падрыхтаваныя дырэктарам тэатра У. Стэльмахам, распавядаць пра драматычныя спектаклі «Час кахання і нянавісці», «Юныя мсціўцы», «Не верце цішыні» па твору І. Шамякіна, камедыю «Рэвізор» па М. Гогалю, казку А. Вольскага і П. Макаля «За дрымучым лесам» і інш., з якімі калектыў тэатра пачынаў новыя сезоны і выязджаў на гастролі ў абласныя цэнтры Беларусі [2, арк. 3–4; 9, арк. 11–13]. Газетныя рэцэнзіі ў зборы Л. Цімафеевай сведчаць аб рэальным поспеху пастаноўкі «Эдзіт Піаф» [17, арк. 2–10].

У фондзе Беларускага тэатральнага аб'яднння (БТА) для даследчыкаў даступны водгук мастацтвазнаўцы Г. І. Барышава аб стане дэкаратыўнага мастацтва ў ТЮГ. На думку Г. Барышава, дэкарацыі да спектакля «Пэпі – доўгая панчоха» адрозніваюцца адзінствам і агульнасцю замысла рэжысёра і мастака-дэкаратара. Дэкарацыі «Дай вады, калодзеж!» прасякнуты адзіным стылем колеру, глыбокім пранікненнем фактур, сілуэтаў, адначасова і разуменнем прынцыпаў нацыянальнага тэатра, яго духа і характару [12, арк. 1–6]. Разважаючы аб прычынах шаблоннасці ў афармленні шэрага спектакляў, Г. Барышаў падкрэсліў ролю рэжысёра ў фарміраванні мастацкага стылю тэатра. Спецыяліст падкрэсліў неабходнасць стварэння ў тэатры экспазіцыі, якая б распавядала гледачам пра гісторыю і калектыў ТЮГ.

У фондзе БТА захавалася і даведка аб стане акцёрскага і рэжысёрскага майстэрства, падрыхтаваная мастацтвазнаўцам С. Пятровічам. С. Пятровіч станоўча адзначае, што тэатр запрашае выпускнікоў тэатральна-мастацкага інстытута. Але творчая моладзь патрабуе дапамогі. Мастацтвазнавец лічыў, што пасля зыходу Л. Мазалеўскай і В. Пацехіна рэжысура стала галоўнай праблемай тэатра. Тэатру не хапала асобы, якая б спалучыла ў сабе якасці высокакласнага рэжысёра і педагога адначасова (як Л. Мазалеўская). Акрамя адсутнасці рэжысёраў-пастаноўшчыкаў, у тэатры існавала складаная сітуацыя з культурай беларускай мовы, музычнай культурай акцёрскага складу і агульным узроўнем яго мастацтва [13, арк. 1–7]. С. Пятровіч выказаў заўвагу больш працаваць з артыстамі над сцэнічнай мовай і беларускай мовай у прыватнасці. Неабходна адзначыць, што пажаданне артыстам больш працаваць над беларускай мовай і павышаць сваё майстэрства выказвалі і іншыя рэцэнзенты спектакляў, напрыклад, А. Каляда і А. Падлужны [14, арк. 1–3]. А. Каляда выказаў меркаванне, што пры адсутнасці пастаянных заняткаў па адасканаленню мовы і акцёрскага майстэрства праз некалькі гадоў большасць артыстаў будуць не ў стане выконваць значымыя ролі.

Вывучэнне фондаў і асабістых збораў паказала, што дакументы і матэрыялы, якія зберагаюцца ў БДАМЛМ, з’яўляюцца каштоўнай крыніцай аб творчых поспехах і эксперыментах тэатральнай установы для дзяцей і юнацтва. Матэрыялы могуць дадаць шмат цікавых старонак у летапіс Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра юнага гледача і яго акцёраў.


*1.* БДАМЛМ. – Ф. 80. Воп. 1. Спр. 12.
*2.* БДАМЛМ. – Ф. 80. Воп. 1. Спр. 23.
*3.* БДАМЛМ. – Ф. 80. Воп. 1. Спр. 24.
*4.* БДАМЛМ. – Ф. 80. Воп. 1. Спр. 44.
*5.* БДАМЛМ. – Ф. 80. Воп. 1. Спр. 125.
*6.* БДАМЛМ. – Ф. 80. Воп. 1. Спр. 231.
*7.* БДАМЛМ. – Ф. 80. Воп. 1. Спр. 279.
*8.* БДАМЛМ. – Ф. 80. Воп. 1. Спр. 290.
*9.* БДАМЛМ. – Ф. 111. Воп. 1. Спр. 47.
*10.* БДАМЛМ. – Ф. 150. Воп. 1. Спр. 42.
*11.* БДАМЛМ. – Ф. 156. Воп. 1. Спр. 28.
*12.* БДАМЛМ. – Ф. 156. Воп. 1. Спр. 853.
*13.* БДАМЛМ. – Ф. 156. Воп. 1. Спр. 854.
*14.* БДАМЛМ. – Ф. 156. Воп. 1. Спр. 856.
*15.* БДАМЛМ. – Ф. 276. Воп. 1. Спр. 16.
*16.* БДАМЛМ. – Ф. 319. Воп. 1. Спр. 28.
*17.* БДАМЛМ. – Ф. 319. Воп. 1. Спр. 30.